# Па магістральных напрамках

## «Бібліятэка як феномен культуры» — анлайн і афлайн

Час паступова, а недзе рашуча ўносіць карэктывы ў арганізацыю міжнародных праектаў і сустрэч. Сёлетні Міжнародны кангрэс «Бібліятэка як феномен культуры», які плануецца 21—22 кастрычніка, пройдзе не толькі ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, але і ў анлайн-фармаце. Сёмы па ліку кангрэс будзе прысвечаны краіназнаўству і краязнаўству як магістральным напрамкам захавання гісторыка-культурнай спадчыны краін і народаў.

У рамках сустрэчы плануюцца пленарнае пасяджэнне, віртуальная прэзентацыйная пляцоўка электронных інфармацыйных рэсурсаў і выдавецкай прадукцыі, асобныя мерапрыемствы па тэматыцы кангрэса і заключнае пасяджэнне. У праграме — правядзенне I Міжнароднага краязнаўчага форуму краін СНД «Гісторыка-культурная спадчына рэгіёнаў: вывучэнне, захаванне, прамоцыя».

Першы дзень кангрэса будзе праходзіць у анлайн-фармаце. Другі дзень — у анлайн-фармаце і ў будынку бібліятэкі. Сярод тэм для абмеркавання — рэгіянальная бібліяграфія, музейнае, гістарычнае, літаратурнае, царкоўнае і аматарскае краязнаўства, гісторыя і культура краін, рэгіёнаў, мясцовасцей. Таксама будуць разважаць пра арганізацыю краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, яе нарматыўнае і метадычнае забеспячэнне; краязнаўчыя бібліяграфічныя рэсурсы і праекты, фонды і калекцыі бібліятэк і іншых арганізацый; краязнаўства ў сістэме сумежных навуковых дысцыплін і відаў дзейнасці; краязнаўства ў асобах. Важным стане абмеркаванне сучасных выдавецкіх праектаў, якія спрыяюць захаванню і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны.

Да ўдзелу запрашаюцца спецыялісты бібліятэк, музеяў, архіваў, навукова-даследчых арганізацый, адукацыйных устаноў, цэнтраў народнай творчасці, краязнаўцы-аматары, распрацоўшчыкі і вытворцы інфармацыйных праектаў, прадстаўнікі грамадскіх і культурных арганізацый беларусаў у замежных краінах, іншыя зацікаўленыя асобы. Для гэтага неабходна



Фота з сайта nlb.by.

*Падчас мінулагодняга кангрэса.*

прайсці анлайн-рэгістрацыю, прадставіўшы тэкст дакладу, не пазней 20 верасня.

Спасылка на трансляцыю кангрэса будзе прадстаўлена перад мерапрыемствам на партале бібліятэкі, зарэгістраваным удзельнікам будзе разаслана па электроннай пошце. Для ўдзелу ў якасці слухача да 15 кастрычніка неабходна прайсці анлайн-рэгістрацыю.

Сярод арганізатараў кангрэса — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў-удзельніц СНД, Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур, Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, Расійская бібліятэчная асацыяцыя.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**